# Мама Лора

***З Ларысай Мікалаеўнай Навіцкай мне давялося працаваць доўгіх 26 гадоў у аддзеле беларускай літаратуры і бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (раней – Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І. Леніна). Яна была бібліёграфам з вялікай літары, чалавекам, заўжды гатовым прыйсці на дапамогу, нешта падказаць маладым супрацоўнікам у пошуках.***



*Ларыса Навіцкая*



*Дзень нараджэння Ніны Ватацы. Першы рад: Святлана Сянькоўская, Раіса Собаль, Алена Касінская, Дзмітрый Давідоўскі. Другі рад: Валянціна Лявонава, Раіса Казючыц, на той час супрацоўнік музея М. Багдановіча Мікола Трус, Н. Ватацы, Л. Навіцкая і Людміла Сільнова.*

У дзевятым нумары часопіса «Маладосць» за 2019 год быў надрукаваны артыкул «Беларускі аддзел», дзе я згадваў як супрацоўнікаў, так і вядомых чытачоў нашай беларускай залы. Не забыўся я тады і пра Ларысу Мікалаеўну. Дзякуючы картатэкам беларускага аддзела яна выконвала вельмі складаныя даведкі для інюркалегіі, і многія людзі маглі б падзякаваць гэтай сціплай жанчыне за атрыманне нечаканай спадчыны з-за мяжы... Хто ж тады ведаў, што роўна праз тры гады мне давядзецца пісаць аб гэтай цудоўнай жанчыне ў мінулым часе? Сёлета 10 кастрычніка Ларыса Мікалаеўна пайшла з жыцця.

Яна нарадзілася 10 лютага 1946 года ў вёсцы Вялікая Слепня (цяпер у межах Мінска). Маленькаю цяжка захварэла і амаль чатыры гады правяла ў дзіцячым санаторыі, паралельна засвойваючы школьную праграму. У 1964 годзе паступіла на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка).

У 1968-м Ларысу Мікалаеўну накіравалі ў Дзяржаўную бібліятэку БССР, якой прысвяціла ўсё прафесійнае жыццё – амаль 50 гадоў. У аддзеле беларускай літаратуры і бібліяграфіі яна прайшла шлях ад бібліятэкара да загадчыка сектара. Л. Навіцкая была выдатным спецыялістам, удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў, з'яўлялася складальнікам бібліяграфічных і навукова-дапаможных паказальнікаў. Высокі прафесіяналізм і глыбокія веды дазвалялі ёй аказваць метадычную і кансультацыйную дапамогу бібліятэкам краіны па розных пытаннях, і ў першую чаргу – па краязнаўстве. Пасля выхаду на пенсію па ўзросце яна працягвала працаваць у бібліятэцы да 2012 года.

Ларыса Мікалаеўна жыла разам з маці, сваёй сям'і ў яе не было, але гэта не перашкаджала ёй быць вельмі чулым, добрым і абаяльным чалавекам. Паміж сабою супрацоўнікі называлі яе не інакш, як мама Лора. У рабочым стале Ларысы Мікалаеўны заўжды ляжалі «грамадскія» грошы. Калі каму-небудзь з нас яны тэрмінова былі патрэбны, а ніхто з супрацоўнікоў пазычыць не мог, то казалі: «Звярніся да мамы Лоры». А калі паміж жанчынамі нашага аддзела ўзнікалі непаразуменні, мама Лора заўжды знаходзіла патрэбныя словы, і ў выніку «сварка» ператваралася ў гумарыстычную сцэнку...

Апошнія некалькі гадоў Ларыса Мікалаеўна была прыкавана да ложка, і ёй было вельмі балюча нават размаўляць. Калі спрабавала нешта, то замест гэтага крычала ад жудаснага болю. Нават разумеючы, што для яе смерць была вратаваннем ад такіх пакут, нам – яе калегам і сябрам – не будзе яе хапаць. Хай зямля будзе для яе пухам.

*Дзмітрый ДАВІДОЎСКІ*